подкормку птиц. Учащиеся активно участвуют в благоустройстве пришкольной территории школы и микрорайона, в городских и республиканских субботниках. Члены клуба «Эколог» заняли 3 место в областном этапе экологического фестиваля «Сердцу милые края», 3 место на районном этапе в акции «Поможем пернатому другу». Юные экологи внесли свой вклад в реализацию образовательного проекта «Зеленые школы». По итогам работы в проекте в 2020г. школе присвоен статус «Зеленая школа» с выдачей диплома 3 степени. Члены клуба «Эколог» занимаются просветительской деятельностью среди учащихся, педагогов, жителей микрорайона. Они изготавливают памятки и листовки по экономии природных ресурсов, охране окружающей среды, разрабатывают плакаты по теме энергосбережения.

**Заключение.** Урочная, внеклассная и исследовательская деятельность формируют у учащихся личную заинтересованность в повышении уровня экологической культуры. Благодаря реализуемому комплексу мероприятий в школе по экономии и бережливости в учреждении у подрастающего поколения воспитывается бережное отношение к природным ресурсам страны. Данная работа в будущем продолжится путем поиска новых форм взаимодействия учащихся, педагогов, семьи.

**Литература**

1. Дулатова, Г.Е. Современные определения экологической культуры / Г.Е. Дулатова // Актуальные задачи педагогики, 2012. – С. 96–99.

2. Формирование экологической культуры школьников [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.n-asveta.by. – Дата доступа: 16.09.2020.

## ПОМНІКІ ДАЎНІНЫ І ПРЫРОДЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ – СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

***М.В. Півавар***

**ДУА "Віцебскае кадэцкае вучылішча", г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь, e-mail: pivavar@gmail.com**

Аховай прыроды на беларускіх землях пачалі займацца яшчэ ў даўнія часы. Варта прыгадаць Статуты ВКЛ, з іх артыкуламі, якія тычыліся пакарання за забойства рэдкіх жывёл і птушак: зуброў, баброў, лебядзей [7]. Сістэмнай праца па ахове прыроднай спадчыны стала толькі на на пачатку XX ст. Так, у БССР пад ахову браліся прыродныя аб'екты, галоўным чынам, рукатворныя – паркі, сады пры былых сядзібах.

5 ліпеня 1926 г. выйшла пастанова Савета народных камісараў БССР «Об объявлении государственной собственностью памятников старины, искусства, быта и природы». Па Віцебскай акрузе (вобласці будуць утвораны толькі на пачатку 1930-х гг.) запаветнымі былі абвешчаны помнікі прыроды: Віцебскі батанічны сад, Віцебскі сад пры партшколе імя Энгельса, вучэбна-паказальны батанічны сад (г. Віцебск, вул. Вараб'ёўская), Бачэйкаўскі сад, Бешанковіцкі сад, Будавецкі сад (арборетум), [«Будовический сад (арборатум) около бывшего



Репозиторий ВГУ

имения»], Вялікалятчанскі батанічны сад, Іванскі сад, Красавіцкі хутар, былы Лескавіцкі сад, Межаўскі сад, Нізгалаўскі сад, Смалянскі сад, Фаміно-Арлоўскі сад (каля в. Фаміно-Арлоўскае?), Фатыньскі сад [4].

Большасць узятых у 1926 г. пад ахову аб’ектаў дайшла да нашых дзён. Рашэннем Бешанковіцкага райвыканкаму № 1012 ад 10.09.2010 г. пад аховай дзяржавы знаходзяцца: Бачэйкаўскі сядзібна-паркавы ансабль, Бешанковіцкі палацава-паркавы ансамбль,. Парк «Саломінка» ў в. Дабрыгоры (Красавіцкі хутар), сядзібны комплекс у в. Двор-Нізгалава (Нізгалаўскі сад). Рашэннем Аршанскага райвыканкаму № 1101 ад 11.12.2009 г. ахоўваецца парк «Межава» [4]. Пад аховай Віцебскі батанічны сад.

Некаторыя паркі і сады моцна пацярпелі і ахоўнага статусу не маюць. Гэта Вялікалятчанскі батанічны сад, Іванскі, Лескавіцкі, Смалянскі, Фатыньскі сады. Сляды Віцебскага сада пры партшколе і вучэбна-паказальнага батанічнага сада ў Віцебску па вул. Вараб’ёўскай адшукаць можна. Аднак ніякіх звестак пра два аб’екта выявіць вельмі складана. Гэта Будавецкі сад (арборетум) і Фаміно-Арлоўскі сад.

Вядомы даследчык паркаў Беларусі А.Т. Федарук у сваіх выданнях іх не згадвае [8]. Няма такіх звестак і ў кнізе У.Г. Анціпава [1]. Вёскі з назвай Фаміно-Арлоўскае ў Віцебскай вобласці зараз няма. Не было такой і ў Віцебскай губерні на пач. XX ст. Мы паспрабавалі пашукаць вёску Фаміно, каля якой знаходзіцца в. Арлова.

Вёска Фаміно і маёнтак Арлова побач (у 2 вярстах) былі ў Крэстоўскай воласці Веліжскага павета. Вёскі Фаміно і Арлова ёсць ва Усмынскай воласці Веліжскага павета. Маёнтак Фаміно (371:123) быў у Невельскім павеце, але на 1926 г. Невельскі павет не ўваходзіў у склад Віцебскай акругі, а знаходзіўся ў межы РСФСР. Яшчэ адзін маёнтак Фаміно быў у Дабрамыслянскай воласці Аршанскага павета, у Вымняскай воласці Віцебскага павета.

Атрымліваецца, што ні адна вёска не падыходзіць. Аднак, атрымаўшы дапамогу філолагаў мы даведаліся, што ў рускай мове да рэформы 1918 г. былі дзве літары Ф: Ф і θ (фіта). Прааналізаваўшы увесь комплекс звестак, мы прыйшлі да высновы, што найбольш верагодна ў пастанове СНК згадваецца былая в. **Фоміно** ў Вазнясенскай воласці Полацкага павета. Яна знаходзіцца зусім побач (2 вярсты) ад в. Чарэпіта Расонскага раена [6, с. 378]. Пры ёй да пачатку XX ст. была сядзіба роду Гласко, у якой быў парк. Ён ахоўваўся дзяржавай у 1970–1990-я гг.[2, с. 385–386; 8, с. 231]. Зараз ахоўны статус зняты. Можна лічыць, што гэта і ёсць той самы помнік прыроды.

Пад “Будовический сад (арборатум)” адпаведна "Спісу населеных месцаў Віцебскай губерні” падыходзяць: 4 вёскі, 1 сяло і 1 фальварак Будніца, маёнтак Будаболь у Полацкім, цяпер Шумілінскім раёне, в. Будаўка, Будадзелы (Вяляшкаўская воласць, цяпер Лёзненскі раён), 4 вескі Буды (Лепельскім, Себежскім, Браслаўскім паветах), маёнткі Будзькаўшчына ў Лепельскім раене і в. Будзянка ў Веліжскім.

Найбольш верагодна, што шукаемы намі арбарэтум знаходзіўся каля маёнтка **Будавесць** Лескавіцкай воласці. Ім валодаў Канстанцін Дзмітрыевіч Паленаў. У маёнтку было 547 дз. зямлі, 5 дз. нязручнай і 90 дз. пад лесам [3, с. 7; с. 31, 497].



Репозиторий ВГУ

Праведзенымі даследаваннямі вернута ў навуковы зварот два былыя важныя помнікі прыроды. Аднак наперадзе шмат больш працы. Хто быў стваральнікамі і ўласнікам гэтых аб'ектаў? Якія калекцыі драўесных раслін меліся ў іх. Чаму яны загінулі? Што засталося? Варта правесці даследаванні рэштак паркаў на прадмет выяўлення экзотаў, інфармаваць мясцовыя адміністрацыйныя і распарадчыя органы ўлады, выступіць у мясцовых СМІ з артыкуламі аб важнасці захавання помнікаў прыроды ў жыцці рэгіёна.

**Літаратура**

1. Антипов, В.Г. Парки Белоруссии / В.Г. Антипов. – Мн., 1975. – 200 с. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мн.: БелЭн, 1985. – 496 с.

2. Землевладение и землевладельцы Витебской губернии в 1905 году. – Витебск: Вит. Губ. Типо-Лит., 1907. – 578 с.

3. Пастанова СНК БССР "Об объявлении государственной собственностью памятников старины, искусства, быта и природы" // Собрание Законов и распоряжений БССР от 3 августа 1926 г. № 3. // таксама ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. – Ф. 571. – Воп. 1. – Спр. 85. – Арк. 18.

4. Решение Оршанского райисполкома № 1101 от 11.12.2009 г.

5. Сапунов, А.П. Список населенных мест Витебской губернии / А.П. Сапунов. – Витебск, 1906. – 31, 497

6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. камент. – Мн.: БМЭ, 1989.

7. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Беларуси / А.Т. Федорук. – Мн.: Ураджай, 1989. – 247 с.

## СЕЛЬСКИЕ АГЛОМЕРАЦИИ КАК ПЕРСПЕКТИВА РАЗВИТИЯ МЕЛИОРИРУЕМЫХ АГРОЛАНДШАФТОВ

***И.В. Пилецкий***

**ВГАВМ, г. Витебск, Республика Беларусь, e-mail: ivan-v@list.ru**

**Введение.** Перспективы дальнейшего технико-технологического развития аграрно-промышленного комплекса (АПК), и на этой основе роста хозяйственно-экономического и социально-культурного потенциала сельских населенных мест и регионов, требуют качественно новых форм и методов рационального использования земельных ресурсов. Как указано в Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития Беларуси на период до 2030 года, «Приоритетными будут мелиорация земель и комплекс мер по рациональному использованию почвенных ресурсов…» [1].

**Цель** нашей работы состояла в установлении возможности повышения эффективности мелиорируемых агроландшафтов в структуре сельских агломераций как организационной и управленческой основы сельских населенных мест по рациональному использованию трудовых, земельных, водных и других природных ресурсов.

Репозиторий ВГУ